одним обязательным моментом в советской историографии при рассмотрении антисоветских выступлений в означенном регионе в 1920–1930-х гг.

Так, постепенно завершается процесс становления советской историографии по проблеме басмачества, стали вырисовываться цементирующие, базисные тезисы советских исследователей, занимавшихся вопросами антисоветского движения в Центральной Азии в 1920–1930-е гг.:

1) басмачество – движение эксплуататоров, буржуазных националистов, лишенное широкой социальной базы;

2) большевистской власти удалось снять национальный и социальный вопросы, лишить мятежников возможности получить широкую поддержку населения благодаря грамотным реформам;

3) басмачество опиралось на иностранную поддержку – в основном из Англии, Франции и Турции через Афганистан и Иран.

В дальнейшем указанные постулаты дополнили и расширили, но главные из них так и остались неизменными. Существование исторической науки в рамках марксистской идеологии значительно ограничивало потенциал исследователей, что в конечном итоге и привело к определенному ее «закостенению».

БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЙ СПИСОК

[1] Никишов П. П. Басмачество // Большая Советская Энциклопедия [Электронный ресурс]. 2011. http://bse.sci-lib.com/article099405.html.

[2] См.: Зевелев А. И., Поляков Ю. А., Чугунов А. И. Басмачество: возникновение, сущность, крах. М., 1981. С. 193.

[3] См.: Сафаров Г. И. Колониальная революция (опыт Туркестана). М., 1921. С. 63.

[4] Там же. С. 89.

[5] См.: Алексеенков П. Т. Что такое басмачество? Ташкент, 1931.

[6] См.: Алексеенков П. Т. Крестьянское восстание в Фергане. Ташкент, 1931.

[7] Там же. С. 34.

[8] См.: Алексеенков П. Т. Что такое басмачество? Ташкент, 1931. С. 65.

[9] Там же. С. 47.

[10] См.: Ильютко Ф. Басмачество в Локае. М., 1929.

[11] Там же. С. 156.

[12] Там же. С. 98.

[13] Там же. С. 113.

[14] См.: Сборник указаний по борьбе с басмачеством. Ташкент, 1924.

[15] Там же. С. 6.

[16] Там же. С. 10.

[17] Там же. С. 26.

[18] Там же. С. 28.

[19] Там же. С. 36.

[20] Там же. С. 58.

[21] См.: Ниалло А. Очерки гражданской войны в Киргизии и Средней Азии. Фрунзе, 1941.

[22] См.: Никишов П. П. Борьба с басмачеством на юге Киргизии. Фрунзе, 1957.

[23] См.: Никишов П. П. Указ. соч. С. 105.

[24] См.: Ниалло А. Указ. соч. С. 87.

[25] См.: Ташлиев Ш. Т. Установление и упрочнение Советской власти в Туркестане. Ашхабад, 1957.

[26] Там же. С. 184.

[27] См.: Тимофеев Н., Ахинжанов М. Казахская ССР. М., 1941. С. 37.

Поступила в редакцию 23.09.13.

Александр Александрович Максимович – аспирант кафедры истории России. Научный руководитель – доктор исторических наук, профессор кафедры истории России В. И. Меньковский.

УДК 316.347(476)(091)

С. М. ХОДЗІН

САВЕЦКАЯ ВЁСКА Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС (1921–1939 гг.): КАМПАРАТЫЎНЫЯ АСПЕКТЫ ГІСТАРЫЯГРАФІІ XX–XXI стст.

Анализируются основные направления исследований советской деревни между двумя мировыми войнами в сравнительно-историческом и региональном аспектах с целью установления тенденций развития белорусской и постсоветской историографии, основные проблемы и преемственность изучения деревни 1921–1939 гг. Отмечается роль ведущих ученых-аграрников в сохранении лучших традиций аграрной истории советского периода. Определяются дискуссионные аспекты и этапы развития аграрной истории в XX–XXI вв.

Ключевые слова: белорусская деревня; аграрная история; советская историография; постсоветская историография; преемственность изучения советской деревни 1921–1939 гг.

The article analyzes the main directions of research in the Soviet countryside between the two world wars in comparative historical and regional aspects. Objective: To determine trends in the development of the Belarusian and post-Soviet historiography, the main problems and continuity of the study villages 1921–1939. The article notes the role of leading agricultural scientists in preserving the best traditions of the agrarian history of the Soviet period. Determined controversial aspects and stages of development of agrarian history in the XX–XXI centuries.

Key words: Belarusian village; agrarian history; Soviet historiography; post-Soviet historiography; the study of the continuity of the Soviet countryside 1921–1939.

Больш за 20 гадоў Савецкі Саюз не існуе на карце свету. За гэты час вырасла пакаленне даследчыкаў, якое не памятае такой дзяржавы, не адчула яе ідэалагічнага ўплыву; можа фарміраваць сваё ўяўленне толькі па водгуках бацькоў і на аснове навуковых і папулярна-публіцыстычных выданняў. Таму актуальным уяўляецца вызначэнне асноўных кірункаў даследаванняў па гісторыі СССР. Цікавым аб'ектам вывучэння па-ранейшаму застаецца аграрнае развіццё, дакалгасная і калгасная вёска. Колькасць і накіраванасць гэтага вывучэння адрозніваецца ў розных рэспубліках былога СССР, але праз вывучэнне асаблівасцей і параўнанне даследаванняў можна вызначыць агульныя тэндэнцыі. Адной з іх выяўляецца імкненне асэнсаваць савецкі гістарыяграфічны вопыт, звярнуцца да напрацовак, што засталіся нам у спадчыну. Такога кшталту даследаванні можна сустрэць у расійскай, беларускай, украінскай гістарыяграфіі, а таксама ў іншых краінах.

Асэнсаванне напрацаванага вопыту часам праводзіцца на аснове аналізу савецкай нацыянальнай палітыкі, праз эвалюцыю росту нацыянальнай самасвядомасці розных слаёў насельніцтва: інтэлігенцыі, рабочых, сялянства, моладзі і г. д. У якасці прыкладу можна прывесці манаграфію казахскай даследчыцы Ж. У. Кыдыралінай «Нацыя і гісторыя»[1]. Такі ракурс вызначыў розныя адносіны да савецкай гістарыяграфіі. Аднак у большасці публікацый адзначаецца і станоўчае, напрацаванае за папярэднія дзесяцігоддзі. Па-першае, на працягу існавання СССР было падрыхтавана некалькі пакаленняў высокапрафесійных даследчыкаў. Пры ўсім тым, што яны былі вымушаныя дзейнічаць пад уплывам рознага ў тыя ці іншыя часы ідэалагічнага ўціску, савецкіх гісторыкаў у цэлым характарызуе высокі ўзровень акадэмічнай культуры. Што ж датычыцца беларускай савецкай гістарычнай навукі, то школа гісторыкаў-аграрнікаў – адна з самых знакамітых у СССР. Па розных прычынах савецкі перыяд аграрнай гісторыі Беларусі быў прадстаўлены меншымі і больш заідэалагізаванымі напрацоўкамі. Але менавіта гэтыя аўтары, атрымаўшы доступ да новых крыніц і магчымасць больш адкрыта фарміраваць свае канцэпцыі, ужо ў постсавецкі час стварылі новыя значныя працы па гісторыі беларускай вёскі (М. П. Касцюк, А. М. Сарокін і інш.)[2].

Савецкая гістарычная школа давала магчымасць гісторыкам больш хутка дзяліцца сваімі напрацоўкамі праз правядзенне ўсесаюзных канферэнцый і выданне часопісаў. Найбольш вядомай і ўплывовай з'явілася такая форма, як Сімпозіум па праблемах аграрнай гісторыі Усходняй Еўропы (у 2008 г. адзначылі яго 50-гадовы юбілей). Сярод арганізатараў і сталых удзельнікаў Сімпозіума – знакамітыя гісторыкі-аграрнікі В. П. Данілаў, І. Я. Зяленін[3]. Дарэчы, Ілля Яўгенавіч, вядомы спецыяліст па гісторыі саўгаснага руху, паўплываў і на лёс беларускага вучонага ў гэтай галіне сялянaзнаўства – Аляксандра Мікалаевіча Сарокіна. Перапляценне, цесны ўзаемаўплыў – характэрная рыса развіцця нацыянальных школ аграрнай гісторыі савецкага перыяду. І. Я. Зяленін з'яўляецца яркім прадстаўніком так званых «шасцідзесятнікаў». 1960-я гг. у гістарыяграфіі – перыяд, калі больш істотнай стала ўвага да вывучэння крыніц (найперш, архіўных), фарміраваліся новыя методыкі вывучэння, пераадольваліся ілюстрацыйнасць і схематызм у адлюстраванні праблемы. Трэба пазначыць, што менавіта ў гэтыя гады выдаецца 36-томная дакументальная серыя «История коллективизации сельского хозяйства СССР». Яна ўключала зборнікі аб кааператыўным калгасным будаўніцтве ў 1917–1927 гг., публікацыі па ажыццяўленню калектывізацыі ў СССР і рэгіёнах і інш. Безумоўна, найперш гэта былі дакументы, якія адлюстроўвалі афіцыйную палітыку і афіцыйны погляд на праблему. Аднак нават ва ўмовах XXI ст. і публікацый новых зборнікаў, новых тыпаў і відаў крыніц гэтае выданне не згубіла сваёй каштоўнасці.

Напрацоўкі, створаныя гісторыкамі СССР напрыканцы 1950-х і ў 1960-я гг. у СССР, таксама ў кожнай з саюзных рэспублік сталі штуршком да гістарыяграфічных прац па аграрнай праблематыцы. Адной з першых з'явілася зноў жа сумесная праца М. Л. Багдэнка і І. Я. Зяленіна. Яны прапанавалі падзяліць працэс савецкай мадэрнізацыі вёскі на тры этапы: падрыхтоўку суцэльнай калектывізацыі (1927–1929); суцэльную калектывізацыю (1929–1933); завяршэнне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі[4].

Стварэнне нарысаў гісторыі калектывізацыі ў саюзных рэспубліках падштурхнула да такога кшталту гістарыяграфічных прац у Беларусі. Сапраўды наватарскай па зместу, пастаноўцы

праблем, наяўнасці «вострых» тэм і пытанняў з'явілася манаграфія У. М. Міхнюка[5]. Уладзімір Мікалаевіч уважліва сачыў за дасягненнямі беларускіх гісторыкаў у галіне аграрнай праблематыкі і ў сваіх наступных працах.

У XXI ст. у апошняй сваёй манаграфіі І. Я. Зяленін перагледзеў прапанаваную раней перыядызацыю на падставе серыі фундаментальных дакументальных публікацый, першая з якіх была ажыццёўлена на мяжы 1990-х – пачатку 2000-х гг. з яго ўдзелам («Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание», т. 1–5; «Деревня глазами ВЧК-ОГПУ-НКВД», т. 1–4). Ён адзначаў, што аграрная палітыка бальшавісцкай партыі і савецкай дзяржавы істотна змянялася і ўдакладнялася пад уплывам шэрагу працэсаў, у прыватнасці барацьбы сялянства – актыўнай ці пасіўнай, і выдзяляў наступныя этапы ў межах 1930-х гг.: канец 1930–1933 гг.; 1934–1936 гг.; 1937–1939 гг.[6] М. А. Іўніцкі ў 2006 г. настойваў на тым, што гэтае пасмяротнае выданне І. Я. Зяленіна, якое «дрэнна адрэдагаванае і ўтрымлівае масу фактычных памылак», дало падставу для асобных гісторыкаў сцвярджаць аб «неанэпе».

У апошнія дзсяцігоддзі з'явіўся шэраг публікацый, у якіх асэнсоўваюцца пэўныя этапы і кірункі ў развіцці гістарыяграфіі савецкай вёскі. Найперш неабходна адзначыць зборнік «Россия в XX веке. Судьбы исторической науки», які быў выдадзены ў 1996 г. пад агульнай рэдакцыяй члена-карэспандэнта РАН А. М. Сахарава. У зборніку былі вызначаны погляды з Захаду на савецкую гістарыяграфію, а таксама пазіцыі вядучых вучоных-аграрнікаў – В. П. Данілава, Ю. А. Палякова і інш. У апошнія гады шэраг публікацый па гістарыяграфіі здзейснілі В. І. Мянькоўскі, А. М. Кананерава[7]. Нягледзячы на пэўныя разыходжанні ў перыядызацыі, усе амаль адзінадушна акрэсліваюць асобны постсавецкі перыяд гістарыяграфіі.

Працы гісторыкаў мяжы XX і XXI стст., першых дзесяцігоддзяў XXI ст. вельмі цесна звязаны з тым этапам савецкай гістарыяграфіі, які называюць «перабудовачным». Этап гэты стаў складаным выпрабаваннем для гісторыкаў. Магчымасць пісаць на розныя тэмы, вызначаючы часам адвольныя вывады, працаваць у раней закрытых фондах уздзейнічала на гісторыкаў, як паветра свабоды на прафесара Плейшнера: яны і не заўважылі, як перайшлі мяжу, дзе навука ўжо адсутнічае. Гісторыя імкліва ператваралася ў публіцыстыку, гісторыкі спяшаліся расказаць найхутчэй пра новыя ацэнкі падзей, часам не шукаючы нават новых крыніц для доказу. Але ад гэтага сутнасць не змянялася, гісторыя заставалася чорна-белай, толькі колеры змяняліся. У матэматыцы ёсць такое правіла: ад перамены месцаў складаемых сума не змяняецца. На пачатку новага, постсавецкага перыяду (1992 г.) вядомыя савецкія гісторыкі Г. А. Бардзюгоў і У. А. Казлоў у прадмове да сваёй кнігі «Гісторыя і кан'юнктура» пісалі: «Мы так імкліва запаўнялі "белыя плямы" мінулага, што не заўважылі, як у адзін прыгожы момант засталіся не толькі без "белых плям", але і без мінулага ўвогуле»[8].

Гэты пераходны да сучаснага савецкі перыяд гістарыяграфіі ўтрымліваў і шэраг станоўчых напрацовак. Па-першае, нават адмоўны вопыт – гэта вопыт. Па-другое, гісторыкі навучыліся не адседжвацца за спінамі палітыкаў, а больш плённа працаваць з публіцыстыкай. Публікацыя артыкула В. П. Данілава ў газеце «Праўда» – яскравы прыклад таго, як можна захаваць навуковасць у публіцыстычных формах выкладання матэрыялу[9]. За перыяд другой паловы 1980-х – пачатку 1990-х гг. былі выдадзены шэраг зборнікаў дакументаў, якія акрэслівалі магчымасць удакладнення раней зробленых вывадаў і ацэнак[10].

У другой палове 1980-х – пачатку 1990-х гг. вызначыліся і тэмы, якія ў далейшым атрымалі развіццё ў постсавецкай гістарыяграфіі. Найперш, гэта тэма рэпрэсій і раскулачвання. Сярод аўтараў, што змястоўна вывучалі такую праблематыку, патрэбна адзначыць Мікалая Аляксеевіча Іўніцкага – аднаго з найбольш аўтарытэтных даследчыкаў па гісторыі савецкай вёскі. Ён прайшоў складаны жыццёвы і прафесійны шлях. Можна меркаваць, што падзеі дзяцінства, калі быў арыштаваны яго бацька, калі падчас раскулачвання яго літаральна адарвалі ад стрыечнай сястры, з якой ён вельмі сябраваў, пакінулі своеасаблівую псіхалагічную траўму на ўсё жыццё. «Хрушчоўская адліга» і наступныя за ёй часы далі яму магчымасць абараніць кандыдацкую дысертацыю па крыніцазнаўству, а ў далейшым – апублікаваць шэраг цікавых прац па калектывізацыі. Асноўны вектар яго прафесійнай накіраванасці склала раскулачванне. Імкненне паказаць гэты працэс рознабакова прывёў да сутыкнення з С. П. Трапезнікавым, які на той час не толькі лічыўся тэарэтыкам па тэме калектывізацыі, але і з'яўляўся загадчыкам аддзела навукі і вучэбных устаноў ЦК КПСС. Зразумела, што як толькі з'явілася магчымасць для больш вольнага выказвання сваёй пазіцыі, у 1988 г. М. А. Іўніцкі выдае манаграфію «Коллективизация сельского хозяйства в СССР: опыт, уроки, выводы» (М., 1988), а ў 1994 г. выходзіць у свет яго знакамітая праца «Коллективизация и раскулачивание (начало 1930-х гг.)», якая ў 1996 г. была перавыдадзена[11]. Нягледзячы на распаўсюджаны ў 1980–1990-я гг. публіцыстычны па-

фас, манаграфія М. А. Іўніцкага аб раскулачванні была напісана навуковай (магчыма, нават у стылі 1960–1970-х гг.) мовай. Аўтар у гэтым выданні імкнуўся пазбегнуць нейкіх навацый, якія запазычваліся на той час маладымі гісторыкамі ў заходніх сацыёлагаў. Пэўнае адступленне ад такога прынцыпу М. А. Іўніцкі дазволіў сабе ў выданні манаграфіі, якая ўбачыла свет у Таронта (Канада). Да манаграфіі з новай назвай «Рэпрэсіўная палітыка савецкай улады на вёсцы (1928–1933)» прадмову напісаў прафесар універсітэта г. Таронта Лін Віола[12]. У кнізе, прысвечанай светлай памяці бацькоў, М. А. Іўніцкі зрабіў вывад аб тым, што «рэпрэсіі і прымус былі і заставаліся важнейшым метадам будаўніцтва сацыялізму на вёсцы»[13].

Неабходна пазначыць ужо даволі распаўсюджанае «з лёгкай рукі» С. О. Шміта вызначэнне «гістарыяграфічнай крыніцы». Простае супастаўленне канцэпцый, падыходаў, высноў звычайна нам нічога не дадае, калі мы не прымаем пад увагу асаблівасці біяграфіі, творчасці гісторыка, умоў і мэт стварэння кожнага навуковага твора. У залежнасці ад асобы гэтыя акалічнасці вызначаюцца ў той альбо іншай ступені. Для маладога гісторыка, не звязанага з папярэднім этапам дзейнасці, апублікаванымі высновамі і ацэнкамі, характэрна найчасцей акрэсліць новыя падыходы, канцэпцыі, больш «вострa» паставіць пытанні. Прафесійны ж вопыт і папярэднія напрацоўкі часам не дазваляюць сталаму аўтару істотна адыходзіць ад заяўленай пазіцыі, падштурхоўваюць да больш узважаных ацэнак падзей.

Безумоўна, што новыя ўмовы дзейнасці і крыніцы даюць вопытнаму гісторыку магчымасць для ўдакладнення высноў і новых ракурсаў вывучэння праблемы. У цэлым гэта характэрна для савецкай гістарыяграфічнай школы. Аддаючы належнае светлай памяці В. П. Данілава (04.03.1925–16.04.2000), Ю. А. Палякова (18.10.1921–27.12.2012), Э. М. Шчагіна (02.03.1933–13.08.2013), можна адзначыць у дачыненні да гэтых вучоных такія характэрныя рысы, як дакладная прынцыповасць, адсутнасць кан'юнктурных хістанняў у канцэпцыях у залежнасці ад змен ва ўладных структурах. Адсутнасць ідэалагічнага ўціску для іх перадвызначыла не ўседазволенасць, а магчымасці стварыць больш асэнсаванае бачанне падзей і з'яў мінулага, адкрыла як бы «другое дыханне».

Адной з постацей, якая аб'ядноўвае «гістарыяграфічны разлом» другой паловы 1980–1990-х гг., з'яўляецца Віктар Пятровіч Данілаў. Менавіта за цыкл манаграфій і дакументальных публікацый па гісторыі расійскай вёскі ён у 2004 г. быў узнагароджаны Залатым медалём імя С. М. Салаўёва. В. П. Данілаў – класік «сялянaзнаўства», яго прозвішча можна ставіць побач з А. В. Чаянавым. На працягу больш чым паўстагоддзя ён быў на чале савецкай, а пасля і постсавецкай школы гістарыяграфіі вёскі ХХ ст. В. П. Данілаў сваю ўвагу засяроджваў найперш на аспектах сацыяльна-эканамічнай гісторыі: у апошнія гады пад уздзеяннем новай «рэвалюцыі зверху» прымаў удзел у канферэнцыях і выступаў па пытаннях узаемастасункаў сялян і ўлады. У пэўнай ступені запаветам палітыкам і нашчадкам яго як вучонага-гісторыка стала праца «Сялянская рэвалюцыя ў Расіі, 1902–1922». У ёй Віктар Пятровіч імкнуўся пазначыць, што рэвалюцыя 1917 г., у тым ліку Кастрычніцкая, не была чымсьці наносным, звязаным толькі з дзейнасцю партыі бальшавікоў. Неразуменне сутнасці падзей 1917 г. якраз і падштурхнула расійскіх палітыкаў першай паловы 1990-х гг. да «суцэльнай фермерызацыі». Але гісторыя, як вядома, не вучыць, яна толькі карае за няведанне яе ўрокаў. Па меркаванню В. П. Данілава, нельга пакідаць па-за ўвагай і калектывісцкія настроі вёскі, якія ў гістарыяграфіі аграрнай гісторыі вывучаны недастаткова. Дарэчы, ён яшчэ пазначае «такі магутны фактар, як абшчынны архетып рускай ментальнасці».

Вывучэнне гістарычнай свядомасці сялянства, як і іншых сацыяльных груп, з'яўляецца адным з цікавых аб'ектаў даследаванняў постсавецкіх гісторыкаў. На наш погляд, істотныя зрухі тут магчымы не толькі дзякуючы новым эмпірычным пошукам, новым дакументам, але і на аснове міждысцыплінарнага вывучэння, праз асэнсаванне напрацаванага сацыёлагамі, філосафамі, эканамістамі. Цэлы пласт новых падыходаў створаны даследчыкамі ў галіне эканамічных паводзін. Абаронены дысертацыі па ўзаемасувязі індывідуальнага і калектыўнага, інстытуцыянальных і этнасацыяльных дэтэрмінантаў эканамічных паводзін. Але адным з найбольш цікавых даследаванняў у гэтым кірунку з'яўляецца манаграфія Ю. Я. Альсевіча[14].

Праблема псіхалагічных асноў эканамічных паводзін інтэрпрэтавалася М. Д. Кандрацьевым, Дж. М. Кейнсам, іншымі вядомымі вучонымі. У 1994 г. грунтоўную манаграфію па пытаннях сацыяльна-псіхалагічных высноў тэарэтычнай псіхалогіі ў галіне эканамічных паводзін выдаў А. Л. Слабадскі[15]. Але абагулена і грунтоўна, вызначаючы цікавыя прыклады з расійскай гісторыі, напісаў па гэтай праблематыцы менавіта Ю. Я. Альсевіч. Яго працы, як і працы іншых вучоных па гэтаму кірунку міждысцыплінарных даследаванняў, заслугоўваюць асобнага далейшага вывучэння.

Значная колькасць публікацый, што ўбачылі свет у апошнія гады, прысвечана пераўтварэнням, якія адбыліся ў тых ці іншых рэспубліках, рэгіёнах Расійскай Федэрацыі[16]. Такія даследаванні дазваляюць у большай ступені прасачыць рэакцыю сялянства на змены ў палітыцы савецкай улады на вёсцы, вызначыць спецыфічныя асаблівасці аграрнага развіцця, а таксама грамадска-палітычнай сітуацыі. Такога кшталту даследаванняў, дарэчы, недастаткова маецца ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі вёскі 1920–1930-х гг. Сярод выніковых прыкладаў постсавецкай хвалі аграрнай гісторыі ў Беларусі бадай можна назваць толькі М. А. Бяспалую, якая на мяжы XX–XXI стст. выдала дзве манаграфіі і абараніла доктарскую дысертацыю[17]. Між тым цікавым аспектам па-ранейшаму застаецца супастаўленне бальшавіцкай палітыкі на вёсцы ў першай палове 1920-х гг. БССР і ўсходняй часткі Беларусі, якая да ўзбуйненняў БССР (1921, 1926) уваходзіла ў склад РСФСР.

Недастаткова даследаваным у Беларусі аспектам аграрнай гісторыі XX ст. з'яўляецца таксама дэмаграфічная сітуацыя ў беларускай вёсцы. Насельніцтва вёскі, вельмі неаднароднае па свайму сацыяльнаму складу, займалася не толькі сельскагаспадарчай працай. Сацыяльныя асаблівасці захаваліся падчас і пасля суцэльнай калектывізацыі. Акрамя сітуацыі, звязанай з дуалізмам калгаснік – індывідуальны гаспадар, фарміраваліся і спецыфічныя сацыяльныя групы. Вельмі цікавым у гэтым кірунку ўяўляецца вывучэнне так званай «рабочай арыстакратыі» ў сельскай гаспадарцы. Сапраўды, на аснове рассяляньвання фарміраваўся сельскагаспадарчы пралетарыят. Сельскія механізатары з'яўляліся па вызначэнню Ш. Фіцпатрык своеасаблівымі «блакітнымі варатнічкамі» вёскі, шэраг даследчыкаў вызначае іх праз тэрмін «рабочая арыстакратыя» (labor aristocracy). Гэты тэрмін быў уведзены ў сярэдзіне XIX ст. Ф. Энгельсам у дачыненні часткі рабочага класа, якая мела прывілеяванае эканамічнае становішча. Нягледзячы на тое што дадзены тэрмін ужывалі і У. І. Ленін, і І. В. Сталін, наяўнасць «рабочай арыстакратыі» ў СССР адмаўлялася. Між тым даследчыкі вёскі адзначаюць, што такія катэгорыі, як трактарысты, камбайнеры, працаўнікі МТС, мелі шэраг сацыяльных і эканамічных пераваг над астатняй часткай сельскагаспадарчага насельніцтва[18]. Гэтыя сацыяльныя групы ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі засталіся па-за ўвагай. Безумоўна, тут паўплывала стварэнне першапачаткова МТС у раённых цэнтрах, своеасаблівая карпаратыўнасць, якая быццам адрывала гэтую частку працаўнікоў вёскі часамі нават геаграфічна. Той жа, хто працягваў жыць у сельскім населеным пункце, хоць і не падпарадкоўваўся калгаснай адміністрацыі, узвышаўся над шэраговымі калгаснікамі, але таксама не меў пашпарта, быў ахоплены сістэмай працоўных павіннасцей вяскоўцаў (у прыватнасці, плаціў падатак з прысядзібнага надзелу).

У дадзеным артыкуле не пераважала імкненне ўсеахопна ахарактарызаваць усе аспекты гістарыяграфіі аграрнай гісторыі. Пры тым, што ў постсавецкай гістарыяграфіі па многіх з гэтых аспектаў літаратура налічвае дзясяткі выданняў, у Беларусі XXI ст. цікавасць гісторыкаў да аграрнай праблематыкі істотна зменшылася. Адным з прыкладаў такога кшталту з'яўляецца тэма голаду 1930–1932 гг. У Беларусі бадай толькі І. М. Раманава больш за іншых спрычынілася да вывучэння гэтай праблемы. Трэба, зразумела, прыняць пад увагу, што не ўсе падзеі аграрнай гісторыі мелі ў беларускай гісторыі такое ж выяўленне, як у нашых суседзяў. Узнікаюць і праблемы, звязаныя з захаванасцю, са спецыфікай крыніц. Тут вельмі важна не схіліцца да «моды», не ісці ўслед за вывадамі, якія паслужліва прапануе публіцыстыка. Адна з асноўных задач дадзенай публікацыі – прыцягненне ўвагі маладых гісторыкаў да праблематыкі аграрнай гісторыі, каб на фоне карэннага перагляду гісторыі паказаць пераемнасць і праз гістарыяграфічныя школы, і праз асобы гісторыкаў.

У заключэнне неабходна пазначыць, што да такой пераемнасці гісторыкі звяртаюцца ўсё часцей. Адным з прыкладаў з'яўляецца выданне калектыўнай манаграфіі «Советское наследство. Отражение прошлого в социально-экономических практиках современной России»[19]. Гэта вельмі істотна, паколькі, канстатуючы факты, не толькі палітыкі, але і гісторыкі часам забывалі пра тое, што ў гісторыі нічога імгненна не змяняецца. Ёсць глыбінныя працэсы (у свядомасці, псіхалогіі, эканамічных паводзінах), якія захоўваюць пераемнасць паводзін чалавека, нягледзячы на «рэвалюцыйныя» змены. Таму, калі мы не заўважым іх у мінулым, не зразумеем сябе ў сучасным, а, магчыма, штосьці не ўбачым у будучым.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

[1] Гл.: Кыдыралина Ж. У. Нация и история. Астана, 2009.

[2] Гл.: Костюк М. П. Социалистические ценности тружеников села: история, современность, перспективы. Минск, 1979; Ён жа. Трудовой вклад крестьянства в победу и упрочение социализма. На материалах БССР. Минск, 1980; Касцюк М. П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мінск, 2000; Сорокин А. Н. Совхозы Белорусской ССР (1917–1941 гг.). Минск, 1979; Ён жа. Эксперимент. Человек и земля. Минск, 1994; Сарокін А. М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска. Ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917–1990-я гады). Мінск, 1999.

[3] Гл.: Зеленин И. Е. Кульминация «Большого террора» в деревне. Зигзаги аграрной политики (1937–1938) // Отечественная история. 2004. № 1. С. 175–180; Ён жа. Революция сверху. Завершение и трагические последствия // Вопросы истории. 1994. № 10. С. 28–42; Ён жа. Политотделы МТС – продолжение политики чрезвычайщины (1933–1934 гг.) // Отечественная история. 1992. № 6; Ён жа. Был ли «колхозный неонэп» // Отечественная история. 1994. № 2; Ён жа. Коллективизация и единоличник (1933 – первая половина 1935 г.) // Отечественная история. 1993. № 3.

[4] Гл.: Богденко М. Л., Зеленин И. Е. Основные проблемы истории коллективизации сельского хозяйства в современной советской исторической литературе. М., 1961.

[5] Гл.: Михнюк В. Н. Крестьянство Белоруссии на пути к социализму: историографический очерк. Минск, 1979.

[6] Зеленин И. Е. Сталинская «революция сверху» после «великого перелома». 1930–1939. Политика, осуществление, результаты (текст). М., 2006.

[7] Гл.: Россия в XX веке. Судьбы исторической науки» / под общ. ред. чл.-кор. РАН А. Н. Сахарова. М., 1996: Современная российская историография / В. И. Меньковский и др.; под ред. В. И. Меньковского: в 2 ч. Минск, 2009; Кананерова Е. Н. К вопросу об основных этапах и направлениях развития советской аграрной историографии // Вестн. Астраханского техн. ун-та. 2009. № 1. С. 127–129.

[8] Бордюгов Г. А., Козлов В. А. История и конъюнктура: субъективные заметки об истории советского общества. М., 1992. С. 3–4.

[9] Гл.: Данилов В. П. Как это было // Правда. 1988. 26 сент.

[10] Гл.: Документы свидетельствуют. Из истории коллективизации. 1927–1932: сб. документов / под ред. В. П. Данилова, Н. А. Ивницкого. М., 1989.

[11] Гл.: Ивницкий Н. А. Коллективизация сельского хозяйства в СССР: опыт, уроки, выводы. М., 1988; Ён жа. Коллективизация и раскулачивание (начало 30-х годов). М., 1994.

[12] Гл.: Ивницкий Н. А. Репрессивная политика советской власти в деревне (1928–1933 гг.). М., 2000.

[13] Там жа. С. 335.

[14] Гл.: Ольсевич Ю. Я. Психологические основы экономического поведения. М., 2009.

[15] Гл.: Слободской А. Л. Экономическое поведение: социально-психологическое обоснование теоретической психологии. СПб., 1994.

[16] Гл.: Грехова Н. Н., Ефимов О. В. Советы и крестьянство в 1917–1928 гг. (на материалах Нижегородской губернии). Арзамас, 2011; Давыдов Д. В. Крестьянство ТАССР в условиях НЭПа: историко-демографическая характеристика. Казань, 2010; Надькин Т. Д. Сталинская аграрная революция и крестьянство (на материалах Мордовии). Саранск, 2006.

[17] Гл.: Бяспалая М. А. Беларуская вёска ў першыя гады нэпа (1921–1923). Мінск, 1999; Яна ж. Эканамічнае і сацыякультурнае развіццё беларускай вёскі ў гады нэпа (1921–1927). Мінск, 2009.

[18] Гл.: Безнин М. А., Димони Т. М. Рабочая аристократия в сельском хозяйстве России 1930–1980-х гг. (новый подход к социальной истории российской деревни. Вологда, 2012.

[19] Гл.: Советское наследство. Отражение прошлого в социально-экономических практиках современной России: монография / под ред. Л. И. Бородкина, Х. Кесслера, А. К. Соколова. Мюнхен; Берлин, 2010.

Паступіў у рэдакцыю 04.09.13.

Сяргей Мікалаевіч Ходзін – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры крыніцазнаўства.

УДК 332.21:930.2(476)

В. Ф. ГОЛУБЕЎ

АБШЧЫНА Ў БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ: ПРАБЛЕМЫ МЕТАДАЛОГІІ ВЫВУЧЭННЯ І ТЭРМІНАЛОГІІ

Рассматриваются проблемы изучения истории сельской общины в белорусской историографии. Анализируются методологические подходы к определению базисных принципов функционирования сельской общины, в первую очередь ее отношение к земле. Приводятся термины, которыми обозначалась сельская община на территории Беларуси в различные исторические периоды. Отмечена ошибочность утверждения о том, что общинное землепользование и переделы земли являются обязательными атрибутами общины. Показано, что в Беларуси после аграрной реформы XVI в. и введения индивидуального землепользования крестьян община продолжала существовать как хозяйственный и социальный институт.

Ключевые слова: община; Беларусь; историография; источники; методология; сельская община; крестьянская община; поземельная община; волость; громада; собственность на землю.

We consider the problem of studying the history of rural communities in the Belarusian historiography. In the paper were analyzed the methodological approaches to the definition of the basic principles of the functioning of the rural community, especially its relationship to the land. Article contains terms that denote a rural community in Belarus in different historical periods. Noted the fallacy of the claim that communal land tenure and land redistribution were essential attributes of the community. It is shown that in Belarus after the agrarian reform of the XVI century and the introduction of individual peasants land tenure, the community continued to exist as an economic and social institution.

Key words: the community; Belarus; historiography; sources; methodology; rural community; peasant community; land community; volost (rural district); gromada (peasant community of a village); ownership of land.

У гістарыяграфіі ёсць некалькі падыходаў да вызначэння тыпалогіі абшчын. Напрыклад, па тыпу вытворчасці (земляробчая, паляўнічая, жывёлагадоўчая і інш.); па канфесійнай